


# Шляхам яднання і згоды



**14 верасня 2023 года гродзенскія пісьменнікі выступілі ў Дзяржаўнай установе адукацыі «Гімназія № 5 імя У. С. Караткевіча г. Гродна». Тэмай творчай сустрэчы з моладдзю пад назвай «Наша сіла – у яднанні і згодзе» стала самае малодое дзяржаўнае свята Беларусі – Дзень народнага адзінства.**

У багатым на славутасці Гродне ёсць мясціны, якія па праве ў той ці іншай ступені можна назваць літаратурнымі. І на тое маюцца свае прычыны. У дружбы 5-й гімназіі і абласной пісьменніцкай арганізацыі багатая гісторыя. Тут рэгулярна адзначаюць яркія культурныя падзеі, праходзяць літаратурныя вечарыны, прэзентацыі новых творчых праектаў. Не абыходзіцца жыццё дзяржаўнай установы адукацыі без спатканняў з мастацкім словам і з тымі, хто яго стварае. Калісьці на базе гімназіі дзейнічаў гурток юнага літаратара, якім кіравала член СПБ, паэтэса Людміла Шаўчэнка. Летась дзяржаўнай установе адукацыі было прысвоена імя класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча.



Напярэдадні Дня народнага адзінства ў госці да гімназістаў, педагогаў і бібліятэкараў завіталі старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла Кебіч і паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. Ініцыятыву сустрэчы падтрымала адміністрацыя гімназіі, і вось у чытальнай зале бібліятэкі ўжо ідзе сяброўская гутарка пра

ідэю новага свята, абмяркоўваецца гісторыя яго ўзнікнення, гучаць радкі заходнебеларускіх паэтаў, герояў падзей тых далёкіх гадоў, калі пасля ўз'яднання заходніх і усходніх зямель Беларусь стала адзінай краінай

У выкананні вучняў гімназіі прагучалі вершы Міхася Васілька, Піліпа Пестрака, Валянціна Таўлая.



**У выкананні вучняў гімназіі прагучалі вершы заходнебеларускіх паэтаў XX ст.**

Людміла Антонаўна Кебіч успомніла аповеды сваёй бабулі пра суровыя часы, калі заходняя частка Беларусі знаходзілася пад уладай панскай Польшчы, калі беларуская мова і культура забараняліся, а чалавек быў пазбаўлены сваіх грамадзянскіх правоў, нават марыць не адважваўся пра элементарную чалавечую годнасць.

Вядомая беларуская пісьменніца, лідар літаратурнай Гродзеншчыны распавяла пра тое, з чым абласная пісьменніцкая арганізацыя сёлета падыходзіць да новага ў Беларусі свята: напрыклад, рыхтуе да выдання тэматычны калектыўны зборнік літаратурна-мастацкіх твораў «Слова яднання». Людміла Антонаўна прачытала нізку сваіх вершаў, створаных спецыяльна да Дня народнага адзінства. А літаратурную сустрэчу з гімназістамі напярэдадні свята было вырашана назваць «Наша сіла – у яднанні і згодзе». З боку гаспадароў у мерапрыемстве прыняла ўдзел настаўнік беларускай мовы і літаратуры, паэтэса Наталля Чакун. Наталля Васільеўна прадэкламавала некалькі вершаў з уласнага зборніка лірыкі «Цвітуць сады».

Паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык павіншаваў прысутных з надыходзячым Днём народнага адзінства і пажадаў, каб імкненне да адзінства было ўсвядомленай неабходнасцю для кожнага беларуса. Таму што толькі так, шляхам яднання і згоды наша грамадства зможа дасягаць ўсебаковага развіцця і ў першую чаргу духоўнай дасканаласці. Цалкам лагічным бачыцца раскрыццё ідэі Свята народнага адзінства прадстаўнікамі арганізацыі, у назве якой на першым месцы стаіць слова «саюз». Як паказала гісторыя, дзяржава са словам «саюз» у сваёй назве

восем дзесяцігоддзяў таму змагло адолець фашызм, атрымаць перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне дзякуючы інтэрнацыянальнаму, духоўнаму адзінству сваіх брацкіх народаў. Паэт прэзентаваў зборнік «Песнярам Айчыны», ідэя якога – у пераемнасці пакаленняў, непарыўнай сувязі культурных эпох, і прачытаў вершы сваіх калег, прысвечаныя гісторыі свята, лёсам і вобразам заходнебеларускіх паэтаў мінулага стагоддзя, а таксама верш свайго аўтарства.

Дзень народнага адзінства – свята яшчэ маладое, але яго гісторыя ўжо багатая, напоўненая трагізмам, болем і радасцю ад перамогі сіл дабра. Запавет нашых класікаў пацвярджае, што толькі шлях яднання і згоды – адзіна правільны напрамак да гэтай перамогі. Імкненне да адзінства думак і пачуццяў, слова і справы, узаемадапамога, прыязнасць, спагада – усё гэта прыродныя якасці беларусаў. І ў гэтым сапраўды наша сіла.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На фота:** «Наша сіла – у яднанні і згодзе» – літаратурнае мерапрыемства пад такой назвай з удзелам Саюза пісьменнікаў Беларусі 14 верасня 2023 года адбылося ў гродзенскай Гімназіі № 5 імя У. С. Караткевіча.





**Выступае Л. А. Кебіч**



**Выступае педагог, паэтэса Н. В. Чакун**







**Д. М. Радзівончык прэзентаваў зборнік пад назвай «Песнярам Айчыны»**







[www.pisateli.by](http://www.pisateli.by)